элементы бел. мясц. узораў; тым самым стварыў новы самабытны тып вырабаў — *слуцкія паясы*. Распрацаваў асн. тыпы дэкору канцоў паясоў: «карумфілевыя», «сухарыкавыя», «вянкова-медальённыя» і інш. Выробленыя ў перыяд яго кіраўніцтва паясы пазначаны меткамі: Sluck, Me fecit/ Sluciae, Me fecit/ Slutiae (1767—76), Me fecit sluciae Joannes Madzarski (1776—80). Каля 1780 перадаў пасаду сыну Лявону. Апошнія звесткі датуюцца 1796.

Л я в о н (каля 1740—1811), мастак-тэкстыльшчык і ткач. Ткацкай справе вучыўся ў бацькі. У 1777—1807 арандатар Слуцкай мануфактуры, якая стала пры ім буйным прадпрыемствам. Стварыў новую сістэму дэкар. аздаблення сярэдніх частак паясоў са складанай арнаменталізацыяй і яркай шматколернасцю і т.зв. «пазітыўкі» — сярэбрана-зялёныя паясы з аздабленнем канцоў гербамі ВКЛ. У 1780—1807 паясы пазначаў меткамі: СЛУЦК, ВЪ ГРАДЕ/ СЛУЦКЕ, ЛЕО МА/ЖАРСКІЙ ВЪ ГРАДЕ/ СЛУЦКЕ. У канцы 1790 набілітаваны, у 1791 атрымаў герб «Дар». З 1792 ротмістр Навагрудскага ваяв. і каралеўскі камергер.

**МАДО́РА**, археалагічны помнік — курганны могільнік 11—12 ст. за 0,5 км на ПнУ ад в. Мадора Рагачоўскага р-на. Размешчаны ва ўрочышчы Шылаў, каля дарогі на в. Кісцяні. Захавалася 25 насыпаў выш. 0,5—2 м, дыям. 10—16 м (5 знаходзяцца наводдаль ад асн. групы). Вядомы з 1873. Абследавалі Л.Д.Побаль у 1962 і А.Р.Мітрафанаў у 1976. Даследавалі ў 1967 Г.Ф.Салаўёва (6 насыпаў), у 1977—79 А.М.Плавінскі і В.Н.Рабцэвіч (7 насыпаў). Пахавальны абрад — трупапалажэнне на гарызонце (у 8 курганах), на пясчанай падсыпцы (у 2 курганах), у падкурганнай яме (1 курган). Жаночыя пахаванні арыентаваны галовамі на З, мужчынскія — на У. Мужчынскія пахаванні без інвентару. У жаночых знойдзены ў асноўным упрыгажэнні: пацеркі (жоўты бісер, срэбра- і золаташкляныя, сердалікавыя прызматычныя), сярэбраны бранзалет з S-падобнымі канцамі, бронзавыя бранзалеты, пярсцёнкі, лунніцы, паясныя кольцы, ліралападобная спражка, аздобленая па краі рэльефнай лініяй з востраканечным выпуклым выступам у сярэдняй частцы, упрыгожаным разеткападобным 4-пялёсткавым арнаментам; таксама выяўлены рэшткі кругавога посуду. Матэрыялы раскопак Г.Ф.Салаўёвай захоўваюцца ў Ін-це археалогіі РАН, А.М.Плавінскага і В.Н.Рабцэвіча — у вучэбнай лабараторыі музейнай справы гіст. ф-та БДУ.

*Літ.:* С о л о в ь ё в а Г.Ф. Славянские курганы близ п. Рогачёва Гомельской обл. // Краткие сообщения Института археологии АН СССР. 1972. Вып. 129; П л а в и н с к и й А.Н. Раскопки курганов в Рогачёвском р-не археологической экспедицией Белгосуниверситета // Старажытнасці Рагачоўшчыны. Мінск; Рагачоў, 2000. *А.М.Плавінскі.*

**МАДО́РАЎ** Фёдар Аляксандравіч (27.2.1890, г.п. Мсцёра Уладзімірскай вобл., Расія — 4.3.1967), беларускі і расійскі жывапісец. Засл. дзеяч мастацтваў Беларусі (1944). Нар. мастак Расіі (1965). Чл. нар. Акадэміі мастацтваў СССР (1950). Вучыўся ў Петраградскай Акадэміі мастацтваў (1914—18). Арганізатар і дырэктар Мсцёрскага маст.-прам. вучылішча і маст. школы-камуны (1918—22). У 1938—41 кіраўнік курсаў павышэння кваліфікацыі мастакоў у Мінску. У 1948—62 рэктар Маскоўскага ін-та імя Сурыкава. Аўтар партрэтаў грамадскіх, паліт., ваен. дзеячаў М.А.Сямашкі (1924), Г.В.Чычэрына (1926), Р.І.Пятроўскага (1928), К.Я.Варашылава (1933, 1963) і інш., удзельнікаў і кіраўнікоў партыз. руху ў Беларусі У.З.Царука (1942), дзеда Талаша (1943), П.К.Панамарэнкі, В.І.Казлова, І.Д.Варвашэні, М.П.Шмырова (усе 1944), В.З.Каржа (1947); групавога партрэта «Героі Першай коннай арміі» (1938); тэматычных карцін, у т.л. «Народны сход у Заходняй Беларусі» (1940), пейзажаў і нацюрмортаў.

**МАДРЫГА́Л** (франц. madrigal, італьян. madrigale ад позналац. matricale песня на матчынай мове), 1) у л і т а р а т у р ы — невял. інтымна-жартоўны верш-камплімент, найчасцей адрасаваны жанчыне. Склаўся ў італьян. паэзіі 16 ст. на аснове М. 14—15 ст. — кароткай любоўнай песні (пад музыку) з матывамі букалічнай паэзіі. У 18 — пач. 19 ст. пашыраны як жанр салоннай і альбомнай лірыкі. У бел. паэзіі адзнакі М. прыкметныя ў вершах М.Багдановіча («Буду сніць і днямі, і начамі»), Ф.Багушэвіча («Каб я мог напісаць тое, што ў думцы...»), М.Танка («Камічна-альбомнае»).

2) У м у з ы ц ы — свецкі муз.-паэт. жанр эпохі Адраджэння. Узнік у італьян. нар. творчасці як аднагалосая лірычная песня на роднай мове (у адрозненне ад песнапенняў на лац. мове). У 14 ст. пашыраны ў форме 2—3-галосай куплетнай песні (часам у інструм. суправаджэнні) з вядучым верхнім голасам. У 16—17 ст. — 4—5-галосы вак. твор а капэла, засн. на нормах поліфаніі «строгага стылю» (А.Віларт, Дж.Палестрына, А.Ласа). У 16 ст. М. быў пашыраны ў харавой музыцы ў ВКЛ. У канцы 16 — пач. 17 ст. наблізіўся да канцэртных і драм. жанраў і стаў асновай мадрыгальнай камедыі.

**МАДУЛЬЁН**, м а д ы л ь ё н (франц. modillon ад італьян. modiglione), архітэктурная дэталь тыпу кранштэйна, якая падтрымлівае вынасную пліту ўвянчальнага карніза, пераважна ў ордарнай архітэктуры. Часам адыгрывае дэкар. ролю. (М. на будынку б. мужчынскай гімназіі ў Гомелі і інш.).

**МАДУЛЯ́ЦЫЯ** (ад лац. modulation, мернасць), змяшчэнне танальнага цэнтра ў канец муз. будовы твора, што абумоўлена гарманічнай роднасцю яго танальнасцей (агульныя акорды); звязаны пераход у інш. танальнасць. Адыгрывае вял. ролю ў фармаўтварэнні дадатковых выразных магчымасцей гукаў, інтанацый,

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

акордаў, садзейнічае пераадоленню танальнай аднастайнасці, стварае няўстойлівасць, стымулюе далейшае драматургічнае развіццё твора. М. ўзбагачае мелодыю і гармонію інтанацыйнымі і гарманічнымі фарбамі, увасабляе сам рух муз. думкі. Зварот гука ў зыходную (гал.) танальнасць прыводзіць да лагічнага завяршэння ўсяго муз. твора. Акрамя зыходнай, існуюць танальнасці ўскосная (кожная інш. ў творы) і заключная, якая дасягаецца ў выніку М. Працэс М. абываецца праз паказ зыходнай танальнасці, вылучэнне агульнага і з'яўленне мадэліруючага акорда, кадансавае замацаванне новай танальнасці. У залежнасці ад ролі ў працэсе фарміравання і развіцця муз. формы, М. падзяляюць на некадэнцыйную (кароткачасовы пераход у новую танальнасць без замацавання яе заключнай кадэнцыяй — гарманічным ці меладычным абаротам, які завяршае муз. будову), кадэнцыйную (з'яўленне заключнай дасканалай кадэнцыі ў пабочнай танальнасці) і супастаўленне танальнасцей, якое праяўляецца ў танальным зруху (рэзкае супастаўленне танальнасцей) і больш дробных зрухах на мяжы муз. фраз (храматычныя секвенцыі). У выніку пераходу ў аднайм. танальнасць другога нахілення, якая мае агульную тоніку, а таксама пры зрушэнні апорных тонаў лада адбываецца ладавая М. Яна ўласціва нар. музыцы ўсх. славян, у т.л. і беларусаў. Ладатанальная М. ў класічнай музыцы стала гарманічнай асновай усіх буйных развітых муз. форм і перш за ўсё санатнай. Спецыфічнай з'яўляецца энгарманічная М., у працэсе якой агульны акорд вырашаецца ў новую танальнасць пры дапамозе энгарманічнай замены (частковая замена тонаў акорда, змена структуры акорда, яго функцый). У джазавай музыцы пры выкарыстанні дапаможнага акорда ці без яго можа ўзнікнуць раптоўная М. Пры гэтым магчыма вяртанне тэмы ў асн. танальнасць. Існуюць прыклады, калі тэма пачынаецца ў адной танальнасці, а заканчваецца ў іншай.

*Літ.*: Дубовский И.И. Модуляция. Москва, 1965; Соколов О.Д. Модуляция. Санкт-Петербург, 2006.

*А.М.Аляхновіч.*

**МАДЭЛІРО́ЎКА** (ад італьян. modellare ляпіць) у выяўленчым мастацтве, перадача аб'ёмна-пластычных і прасторавых уласцівасцей прадметнага асяроддзя сродкамі святлоценявых градацый (жывапіс, графіка) або адпаведнай пластыкай трохвымерных форм (скульптура) з мэтай перадачы ідэйна-вобразнай характарыстыкі прадмета, абагульнення, выяўлення і ўзмацнення істотнага ў ім. У жывапісе ажыццяўляецца сродкамі колеру, перспектывы, святлаценю, у скульптуры — пластыкай пэўнага матэрыялу (гліна, пластылін, воск).

**МАДЭ́ЛЬ** (франц. modèle узор ад лац. modulus мера, узор, норма), 1) узор (эталон) якога-небудзь вырабу для серыйнай ці масавай вытворчасці. 2) Тып, марка, узор канструкцыі. 3) Прадмет маст. адлюстравання (натура); чалавек, які пазіруе мастаку (натуршчык). 4) Узнаўленне, імітацыя якога-н. прадмета, часцей у змешаным выглядзе (напр., М. самалёта). 5) Узор прадмета (звычайна з матэрыялу, што лёгка апрацоўваецца), з якога вырабляецца форма для ўзнаўлення ў інш. матэрыяле (напр., ліцейная М., з дапамогай якой робіцца рабочая поласць у ліцейнай форме). 6) Схема, апісанне якой-н. з'явы ці працэсаў, што адбываюцца ў прыродзе і грамадстве. 7) Канструкцыя, якая перадае, імітуе (звычайна ў зменшаным маштабе) будову і дзеянне якога-н. інш. («сапраўднага») аб'екта ў навук., вытв. ці спарт. мэтах.

**МАДЭ́РН** (ад франц. moderne найноўшы, сучасны), стыль у еўрапейскай і амер. маст. культуры, які ўзнік у канцы 19 ст. як рэакцыя на *эклектызм* і нятворчае капіраванне гіст. стыляў мінулага. Пашырыўся ў пач. 20 ст. Характэрны найперш для архітэктуры, выяўл. і дэкар.-прыкладнога мастацтва. М. ўласцівы імкненне да сінтэзу розных відаў пластычных мастацтваў, спалучэнне маст. і ўтылітарных функцый артэфактаў культуры, актыўны пошук новых (часам эпатажных) форм маст. выразнасці, наяўнасць пышных і незвычайных элементаў дэкору, выкарыстанне сучасных тэхналогій і матэрыялаў (напр., металу і шкла ў архітэктуры). У канцы 19 — пач. 20 ст. ў бел. мастацтве рысы М. заўважаліся ў асобных творах архітэктараў і мастакоў (С.Шабунеўскі, К.Данцоў, Ф.Рушчыц, С.Богуш-Сестранцэвіч, Я.Драздовіч і інш.).

У архітэктуры прадстаўнікі М. імкнуліся стварыць стыль, вызвалены ад гіст. запазычанняў, кампіляцый, ордарнай сістэмы. Вызначаецца свабоднай функцыянальна абгрунтаванай планіроўкай, новымі прынцыпамі авангарднага формаўтварэння (звычайна дынамічнага, экспрэсіўнага характару), асэнсаваннем новых канструкцый і матэрыялаў. У рамках М. архітэктура выступае як сінтэзіруючае мастацтва з пластычнай арганізацыяй знешніх форм, набліжанай да скульптуры, і маляўнічымі крывалінейнымі рысамі дэкору. Найперш гэта праяўляецца ў абрысах праёмаў, дзвярных і аконных пераплётах, малюнку металічных крат. У архітэктуры Беларусі М. атрымаў распаўсюджанне ў пач. 20 ст. Вылучылася некалькі кірункаў: сэцэсіён, ***неарускі стыль***, ***неараманскі стыль***, ***неаготыка***, ***неабарока***, ***неакласіцызм***, ***неарэнесанс*** і інш. Найб. выразна праявіўся ў тыповых для эпохі будынках — асабняках (сядзібны дом у г.п. Жалудок Шчучынскага р-на), гандлёвых і дзелавых будынках (банк на вул. В.Крайняга ў г. Слонім), вакзалах (чыг. вакзал у г. Маладзечна), выставачных залах і кінатэатрах (праект кінатэатра «Сатурн» у г. Гродна). У стылі М. працавалі архіт. А.Альшалоўскі, Б.Астравумаў, К.Данцоў, У.Марконі, С.Шабунеўскі, К.Шрэтэр і інш.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ